***Пацыенка С.А.***
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

# ДУХОЎНАЯ КУЛЬТУРА МАГНАТАЎ БЕЛАРУСКАГА ПАНЯМОННЯ: РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

*Даклад прысвечаны даследаванню спецыфікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння. Аўтарам выяўлены фактары, якія аказалі ўплыў на працэс яе фарміравання. У якасці цэнтраў бытавання духоўнай культуры разгледжаны прыватнаўласніцкія рэзідэнцыі Беларускага Панямоння, у арганізацыі прасторы якіх адлюстравалася іерархія каштоўнасцяў культуры арыстакратаў.*

*The article explores the spiritual culture of the Belarusian Ponemanya's magnates. The factors influencing the process of its formation are identified. As the centers of magnate's spiritual culture have represented privately owned residences of the Belarusian Ponemanya. The hierarchy of values of this culture is reflected in residences' space organization.*

Даследаванне культуры пэўнай сацыяльна-гістарычнай супольнасці прадстаўляе сабой перспектыўны кірунак сучаснай культуралагічнай думкі. Вывучэнне духоўнай культуры беларускай гістарычнай эліты ў рэгіянальным аспекце выклікае асаблівую цікавасць з прычыны недастатковай даследаваннасці і шматзначнасці дадзенай з'явы.

Беларускае Панямонне – багаты і разнастайны ў культурным плане гісторыка-этнаграфічны рэгіён. Землі Панямоння, якія з'яўляліся аднымі з самых развітых і густанаселеных ва ўсходнеславянскім свеце ў XIII ст., сталі ядром Вялікага Княства Літоўскага.

Працэсы фарміравання культуры магнатаў Беларускага Панямоння залежалі ад шэрагу фактараў. Разнастайнасць духоўнага жыцця была абумоўлена з'явамі, якія адбываліся ў палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, рэлігійнай сферах. Спалучэнне комплекса фактараў забяспечвала разнастайнасць культуры і інварыянтнасць яе ўзораў.

Асаблівасці развіцця культуры, выбару яго кірункаў напрамую залежалі ад геапалітычнага фактара. Вынікам геаграфічнага размяшчэння земляў Беларускага Панямоння сталі цесныя кантакты з польскай культурай. Культурныя ўплывы польскай арыстакратыі праявіліся ў запазычанні гербавай сімволікі, прыняцці ідэалогіі сарматызму, выкарыстанні польскай мовы ў дзяржаўным справаводстве і інш. За ўсю гісторыю суіснавання працэс узаемадзеяння паміж гэтымі культурнымі сістэмамі быў даведзены да аўтаматызма. Разам з тым, у гэтым узаемадзеянні прасочваўся не толькі прамы ўплыў польскай культуры, але і ўплыў культур іншых краін Еўропы. Культура Каралеўства Польскага, у сваю чаргу, знаходзілася ў арэале заходніх уплываў і выступала як рэцыпіент у дачыненні да донарскай еўрапейскай культуры. Польскае Каралеўства – своеасаблівы пасрэднік, культурная прастора якога з'яўлялася месцам адаптацыі заходнееўрапейскіх узораў да культурнага ўзроўню ВКЛ. Прымаючы да ўвагі, што актыўнасць культурных працэсаў зніжаецца ад цэнтра да перыферыі, можна меркаваць, што тэндэнцыі еўрапейскай культуры найбольш інтэнсіўна на землях Вялікага Княства Літоўскага праяўляліся менавіта на тэрыторыі Панямоння.

Непасрэднае памежнае існаванне і цесныя ўзаемныя кантакты, якія адбываліся паміж культурамі ВКЛ і Каралеўства Польскага пачынаючы з XVI ст., даюць падставу меркаваць, што ў дадзеным выпадку мелі месца працэсы акультурацыі. У адпаведнасці з вызначэннем, дадзеным Р. Рэдфілдам, Р. Лінтанам і Дж. Херсковіцам, «акультурацыя ахоплівае сабой тыя з'явы, якія ўзнікаюць у выніку ўваходжання груп індывідаў, якія валодаюць рознымі культурамі, у непарыўны непасрэдны кантакт, што выклікае наступныя змяненні ў першапачатковых культурных патэрнах адной з груп ці іх абедзвюх» [1, с. 348–349].

Напрыклад, у працэсе пошукаў новых форм магнаты, якія будавалі свае замкі на тэрыторыі Беларускага Панямоння, звярталіся да ўзораў еўрапейскага дойлідства, што было натуральным, улічваючы ўключанасць культуры гэтага рэгіёну ў еўрапейскі кантэкст. Аднак, калі для замкаў перыяду агульнадзяржаўнага будаўніцтва быў уласцівы зварот да тэрытарыяльна блізкіх архітэктурных форм (напрыклад, такіх як ордэнскія замкі-кастэлі – аналагі Крэўскі, Лідскі), то прыватнаўласніцкія рэзідэнцыі імкнуліся да запазычання будаўнічых прынцыпаў больш аддаленых цэнтральна- і паўднёваеўрапейскага рэгіёнаў. Прычынай гэтага, па-першае, стала павелічэнне ў XVI ст. колькасці замежных вандровак, якія ажыццяўлялі магнаты. Па-другое, у 1518 г. адбыўся шлюб вялікага князя і караля польскага Жыгімонта I

Старога з італьянкай Бонай Сфорцай. Нельга не заўважыць значнасці гэтай падзеі, вынікам якой стала непасрэднае пранікненне на тэрыторыю Панямоння ўзораў італьянскай культуры.

З другой паловы XVI ст. у прыватнаўласніцкім замкавым будаўніцтве пачалі актыўна выкарыстоўвацца дасягненні італьянскай інжынерна-фартыфікацыйнай навукі. Аднак самым самым яскравым прыкладам стала дзейнасць запрошанага ў Нясвіж Мікалаем Крыштофам Радзівілам манаха ордэна езуітаў Джавані Марыя Бернардоні. Архітэктурная спадчына Бернардоні на тэрыторыі сучаснай Беларусі (Нясвіжскі замак, касцёл Божага Цела і інш.) з'яўляецца вынікам плённага супрацоўніцтва і гарманічнага суіснавання італьянскай і беларускай культурных традыцый у межах агульнаеўрапейскай культуры канца XVI ст.

Відавочна роля палітычнага фактара ў фарміраванні культуры магнатаў Беларускага Панямоння. На кожным гістарычным этапе мелі месца знакавыя падзеі, якія ў многім прадвызначалі кірунак далейшага развіцця культуры. Такімі падзеямі з'яўляліся, напрыклад, утварэнне Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, стварэнне федэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай з Польскім Каралеўствам, падзелы Рэчы Паспалітай і інш. Тым не менш, нельга абсалютызаваць уплыў палітычных з'яў на культурнае жыццё. Насуперак агульнапрынятай тэндэнцыі ўспрыняцця другаснасці культурных працэсаў у адносінах да палітычных, мы падтрымліваем думку, выказаную С. Куль-Сяльвёрставай, аб неправамернасці разгляду культуры як падпарадкаванай, другараднай галіны жыцця грамадства [4, с. 12]. Нярэдка менавіта культурныя працэсы абумоўлівалі вырашэнне палітычных або рэлігійных пытанняў.

Выгаднае геаграфічнае становішча Панямоння спрыяла сацыякультурнаму развіццю рэгіёну. Спецыфічнасць гэапалітычных умоў Панямоння адзначыў А. Краўцэвіч, які піша, што пасля перамогі ў Грунвальдскай бітве (1410) «набегі крымскіх татараў на Беларусь прыходзіліся галоўным чынам на яе паўднёва-ўсходнія землі. Татарскія атрады часам даходзілі да Сярэдняга Панямоння, але сур'ёзнай пагрозы яго гарадам не стваралі. Землі Беларускага Панямоння засталіся ў баку ад асноўных ваенных дзеянняў пад час паўстання Налівайкі ў канцы XVI ст…» [3, с. 68]. Такія адносна спрыяльныя ўмовы садзейнічалі эканамічнаму і культурнаму развіццю гарадоў Панямоння.

Значным культурным цэнтрам Беларускага Панямоння быў горад Гродна – сядзіба вялікіх князёў літоўскіх і каралёў польскіх. Тут размяшчаліся рэзідэнцыі манархаў іншаземнага паходжання Боны Сфорцы, Стэфана Баторыя, якіх прыцягвала не толькі геаграфічная блізкасць, але і падабенства ў сацыякультурнай сферы. Як адзначае мастацтвазнаўца В. Бажэнава са спасылкай на сучаснага польскага гісторыка Я. Сташэўскага, «кароль Аўгуст III, узводзячы замак у Гродна, ставіў сваёй мэтай не толькі пабудаваць рэзідэнцыю на час сеймаў, але і стварыць у гэтым горадзе цэнтр «палітычнага» саюза Саксоніі, Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, але на тэрыторыі апошняга» [2, с. 18].

Спецыфіка геаграфічнага размяшчэння земляў Беларускага Панямоння спрыяла актыўным міжкультурным і міжэтнічным узаемадзеянням у рэгіёне. У выніку неаднароднасці этнічнага складу жыхароў, ва ўмовах сінтэзу традыцый на тэрыторыі Беларускага Панямоння сфарміраваўся своеасаблівы рэгіянальны тып культуры. Праяўленне агрэсіі з аднаго боку тэўтонскай, а з іншага – мангола-татарскай актывізавала ў сярэдзіне XIII ст. перасяленні на тэрыторыю Панямоння жыхароў з Мазовіі, Прусіі, Жэмайціі, а таксама – паўднёва-рускіх зямель [5, с. 386]. Гэтыя фактары спрыялі ўзбагачэнню культуры рэгіёну традыцыямі прадстаўнікоў іншых этнасаў. Узаемадзеянне з іншымі сацыякультурнымі сістэмамі стымулявала развіццё і фарміраванне разнастайнасці культурных узораў у рэгіёне. Адначасова такія ўзаемаадносіны спрыялі захаванню і нават узмацненню ідэнтычнасці мясцовай эліты, якая імкнулася замацаваць свае ўладныя пазіцыі.

Рэлігія, як спецыфічная сістэма каштоўнасна-сэнсавых установак, займала значныя пазіцыі ў светапоглядзе магнатаў. Суіснаванне шэрагу канфесій, рэлігійны плюралізм і верацярпімасць з'яўляліся заканамерным вынікам асаблівага геапалітычнага становішча Беларускага Панямоння. Канфесійны фактар стаў моцным імпульсам для дынамічных працэсаў у духоўнай культуры магнатаў. Разгледзім гэта на прыкладзе Рэфармацыі.

Рэлігійны і грамадска-палітычны рух, ахапіўшы Еўропу, у сярэдзіне XVI ст. распаўсюдзіўся на землі Беларускага Панямоння. У выніку мясцовая сацыякультурная практыка ўзбагацілася дасягненнямі заходнееўрапейскай культуры. Папулярнасць ідэй Рэфармацыі на землях Беларускага Панямоння была абумоўлена, у першую чаргу, падрыхтаванасцю эліты да ўспрыяцця гэтых навацый. Магнатам, добра знаёмым з культурным жыццём еўрапейскіх краін, былі зразумелы пытанні, узнятыя рэфарматарамі. Разнастайнасць ідэйных плыняў, узнікшых у працэсе дыскусій, з аднаго боку, і рэлігійны плюралізм, які існаваў у ВКЛ, з другога, – давалі магнатам свабоду выбару. У некаторай ступені прыняцце пратэстантызму можна разглядаць як спробу стварэння новай элітарнай традыцыі, абумоўленую патрэбнасцю змяненняў у культурным працэсе.

Азначэнне паняцця «магнат» прадугледжвае такую характарыстыку, як буйны землеўладальнік. У гэтай сувязі мэтазгодна разгледзець уплыў эканамічнага фактара. Працэс фарміравання магнацкіх уладанняў пачаўся ў Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XIV ст. Гістарычна склалася так, што рэгіён Беларускага Панямоння з'яўляўся адным з найбольш эканамічна развітых на тэрыторыі краіны. Значным этапам гаспадарча-эканамічнага развіцця рэгіёну стала рэарганізацыя сістэмы землекарыстання, якая завяршылася правядзеннем ў 1557 г. аграрнай рэформы, атрымаўшай назву «валочнай памеры». Актыўна развіваліся гарады Панямоння – Гродна, Навагрудак, Слонім і інш.

Адной з умоў узнікнення культуры магнатаў Беларускага Панямоння стала выдзяленне высакародных землеўладальнікаў з агульнай масы вышэйшага саслоўя. Паступовае ўскладненне структуры саслоўя спрыяла дыферэнцыяцыі групы магнатаў, як прадстаўнікоў элітарнай меншасці. Гэта азначае, што знешняя дэтэрмінаванасць узнікнення культуры магнатаў была абумоўлена сацыяльнымі фактарамі.

Культура магнацкай супольнасці характарызавалася цэласнасцю і мела шэраг спецыфічных рыс. Карціна свету асноўвалася на ідэалагічнай дактрыне «залатой вольнасці» – комплексе заканадаўча аформленых правоў і прывілеяў. Шляхецкія вольнасці дэкларавалі культ павагі свабод кожнага прадстаўніка вышэйшага саслоўя. Магнаты карысталіся шырокім спектрам свабод: ад асабістай недатыкальнасці і права на ўласнасць да свабоды веравызнання, уступлення ў саюзы, выезду за мяжу і інш.

Карціна свету магнатаў уключала ўяўленні аб паходжанні, дзе прынцыповае значэнне мелі знатнасць і старажытнасць. У сям'і на першых этапах фарміравання асобы ў дзіцячую свядомасць закладваліся паняцці магутнасці роду і велічы продкаў, шляхецкага гонару, будучага прызначэння ў службе сваёй дзяржаве і г.д.

Асаблівае месца ў іерархіі каштоўнасцей культуры арыстакратаў адводзілася паняццю «шляхецкага гонару». Кодэкс рэгуляваў адносіны ў магнацкім асяроддзі, вылучаў комплекс патрабаванняў да асобы арыстакрата. Так, арыстакрат са зброяй у руках павінен абараняць Айчыну, свайго гаспадара – вялікага князя, свой гонар і гонар блізкіх яму людзей; быць добрым ваяром, смелым, храбрым, прытрымлівацца пастулатаў вайсковай этыкі: быць велікадушным да пераможаных, паважаць роўных сабе па становішчы (нават ворагаў), выконваць абяцанні і інш.

Важнае значэнне надавалася сімволіцы і этыкетна-цырыманіяльнай арганізацыі жыцця. Урачыстасці з'яўляліся знакавымі дзеяннямі і патрабавалі дакладнай цырыманіяльнай арганізацыі. Разнастайныя сімвалы, знакі, атрыбуты, якія акружалі магнатаў, выконвалі функцыю захавання культурнага кода. Так, знатнасць паходжання не толькі фіксіравалася шэрагам дакументаў, але замацоўвалася геральдычным апаратам. Сімволіка арыстакратычнай культуры адлюстравалася ў замкавай прасторы. Распаўсюджанай з'явай у магнацкіх замках было аздабленне кафляных печаў, камінаў геральдычным арнаментам з выявамі гербаў уладальнікаў (каміны ў Гальшанскім, Нясвіжскім замках). Значнае месца адводзілася вайсковым атрыбутам: зброя ўвасабляла культ воіна, выступаючы як сімвал адвагі, смеласці і высокародства, а таксама з'яўлялася сведчаннем прыналежнасці да шляхецкага стану.

Спецыфічнасць светаўспрыяцця магнатаў патрабавала падтрымкі асаблівага стылю і ладу жыцця. Прадстаўнікі магнацкіх родаў акрамя вайсковай службы маглі займаць вышэйшыя дзяржаўныя і адміністратыўныя пасады, аднак ім забаранялася займацца рамёствамі ці гандлем. Шлюб разглядаўся як сродак падтрымання ці павышэння статуса ў грамадстве, таму магнатам дазвалялася браць шлюб толькі з прадстаўнікамі свайго саслоўя. Асаблівую ролю ў культуры магнатаў адыгрываў гульнёвы аспект, які праявіўся ў прыхільнасці магнатаў да відовішчна арганізаваных мерапрыемстваў (паляванняў, баляў, прыёмаў і інш.).

Асноўнымі асяродкамі бытавання культуры магнатаў былі прыватнаўласніцкія рэзідэнцыі. Регіён Панямоння характарызаваўся слабасцю ці нават адсутнасцю ўмацаванняў у дзяржаўных гарадах пры адначасовай фартыфікацыйнай дасканаласці прыватнаўласніцкіх гарадоў і рэзідэнцый, што адлюстроўвала асаблівасці палітычнага і эканамічнага стану магнатаў гэтага рэгіёну. На тэрыторыі Панямоння ў розныя часы размяшчаліся буйныя магнацкія ўладанні, сярод якіх былі рэзідэнцыі Агінскіх, Гаштольдаў, Пацаў, Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў і інш. Наяўнасць уласнага ўмацаванага замка з вайсковым гарнізонам дэманстравала права арыстакратаў на асабістую свабоду і незалежнасць не толькі ад знешніх ворагаў, але і ад улады вялікага князя і караля.

Такім чынам, рэгіянальныя асаблівасці духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння былі абумоўлены ўздзеяннем такіх фактараў, як геаграфічны, палітычны, этнічны, эканамічны, канфесійны, сацыяльны. Спецыфічнасць гэтай культуры заключалася ў шматварыянтнасці дэтэрмінацыі, разнастайнасці сацыякультурных працэсаў і высокай ступені іх інтэнсіўнасці.

## ЛІТАРАТУРА

1 Антология исследований культуры / отв. ред. Л.А. Мостова. – СПб. : Унив. кн., 1997. – Т. 1 : Интерпретации культуры. – 548 с. – (Культурология XX век).
2 Баженова, О.Д. Радзивилловский Несвиж. Росписи костёла Божьего Тела / О.Д. Баженова. – Минск : Харвест, 2010. – 414 с.
3 Краўцэвіч, А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV–XVIII стст.: планіроўка, культурны слой / А.К. Краўцэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 170 с.
4 Куль-Сяльверстава, С.Я. Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: фарміраванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII ст. – 1820-я гады) / С.Я. Куль-Сяльверстава. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2000. – 259 с.
5 Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл., 1989. – 375с.

***Ракова Л.В.***
*(Республика Беларусь, г. Минск)*

## ЖЕНСКИЙ КОСТЮМ БЕЛОРУССКО-РУССКОГО ПОГРАНИЧЬЯ: ЭТНОКУЛЬТУРНОЕ ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ И ОСОБЕННОСТИ РАЗВИТИЯ КОН. XIX– НАЧ. XX ВВ.

В последнее десятилетие тема изучения пограничных территорий становится одной из популярных. При поддержке гуманитарных фондов проводятся комплексные совместные исследования ученых разных стран картины этнокультурных связей и особенностей жизнедеятельности населения пограничных регионов, а также различные научные конференции, посвященные данной теме. В данной работе рассматривается белорусско-русское пограничье, которое является ареалом пересечения культурных традиций контактирующих народов, тесно связанных общностью исторических судеб и глубокими историко-культурными связями. Границы обоих государств постоянно менялись в результате многочисленных войн, которые происходили между ВКЛ (позже Речью Посполитой) и Русским государством. В конце XVIII ст. в результате 1-го раздела РП к Российской империи была присоединена значительная часть Оршанского, Полоцкого, Витебского, Мстиславльского, Речицкого уездов Беларуси **[20, с. 36–39].**

В XIX веке в состав Беларуси входили несколько уездов западной и центральной части Смоленщины, которые назывались Белорусской Смоленщиной. В начале XX в. к ней присоединены были еще несколько волостей Гомельской губернии и Велижский уезд Витебской. Государственная граница разделяла Могилевскую, Гомельскую, Витебскую области Беларуси и Смоленскую, Брянскую области России. Старожилы русских районов до сих пор называют западную часть Смоленщины Белоруссией. И сегодня различия в этой части Смоленщины наиболее заметны в жилище, традиционном костюме, бытовой жизни, обрядах, фольклоре, языке населения.

На Смоленщине сложилась этнографическая культура двух основных этнических групп – русских и белорусов. В разные исторические эпохи эти этносы испытывали влияние культур соседних народов. Повседневный опыт сосуществования этнокультурных групп в различных сферах этнической культуры (семейно-брачной, хозяйственно-бытовой, религиозной, языковой) отразился на складывании здесь в результате этнокультурного взаимодействия специфических комплексов костюма, в которых смешались традиции обеих культур, различавшихся в локальных вариантах. Особенно убедительно этнографическое разнообразие основных регионов Смоленщины выражено в женском костюме, как наиболее сохранившемся.

Сложность изучения этнологических аспектов восточнославянского пограничья, как верно отмечает М.Ю. Мартынова, связана с тем, что “граница между идентичностями и культурами соседствующих этнических групп, как правило, не бывает четкой, она размыта. Можно говорить о существовании на пограничье особой смешанной формы культуры”. **[15, Мартынова, с. 11].** По мнению российского исследователя А.К. Байбурина, современные исследователи нередко ранжируют ситуацию пограничья некорректно, с диаметрально противоположных позиций. Так, первые необоснованно утверждают, что русская национальная культура обладает исключительностью и имеет иммунитет в отношении культур других народов, которые практически не оказывают влияние на нее, а потому она выступает своего рода донором в отношении культур других народов. Другие считают, что она состоит исключительно из заимствований, а потому отвергают самобытность и неповторимость национальной культуры народа [2, **Байбурин, с. 3–4**].

На наш взгляд, в зоне пограничья существует особая коммуникативная модель, где сокращаются этнические дистанции и проявляется культурный синкретизм, в том числе и в костюме. Трудно не согласиться с мнением российского ученого С.А. Арутюнова о том, что между культурами соседствующих народов обычно “протягиваются линии их взаимодействия, контакта, взаимного или одностороннего проникновения” и могут включаться элементы, которые “не всегда становятся